накіраваная на ўдасканаленне падрыхтоўкі спецыялістаў вышэйшай адукацыі. Структуру ВМК павінны вызначаць на адпаведнай кафедры. У нашым выпадку яна можа быць адзінай для студэнтаў завочнай і дзённай формаў навучання, нягледзячы на тое, што навучанне адбываецца па розных вучэбных планах.

***Саломка А.І., дацэнт***

## УДАСКАНАЛЕННЕ САМАСТОЙНАЙ ПРАЦЫ СТУДЭНТАЎ-ЗАВОЧНІКАЎ ПА КУРСЕ "ГІСТОРЫЯ ЗАМЕЖНАЙ І БЕЛАРУСКАЙ КНІГІ"

Асноўнай формай арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу на завочнай форме навучання з'яўляецца самастойная праца студэнтаў (СПС). Выкладанне тут неабходна разглядаць як сістэму кіравання самастойнай працай студэнтаў. І асабліва значэнне набывае арганізацыйнае і метадычнае забеспячэнне. Арганізацыйныя фактары ствараюць умовы для паспяховага ажыццяўлення СПС. Метадычнае забеспячэнне прадугледжвае педагагічна мэтазгоднае кіраванне СПС з боку выкладчыка з улікам навыкаў і рытмічнасці самастойнай працы.

На курс "Гісторыя замежнай і беларускай кнігі" адводзіцца крайне абмежаваная колькасць аўдыторных заняткаў. Гэта традыцыйныя формы ўключэння студэнтаў у самастойную працу: лекцыі, семінары, лабараторныя заняткі, у ходзе якіх студэнты атрымоўваюць рэкамендацыі, метадычную літаратуру і іншыя неабходныя матэрыялы да залікаў і экзаменаў.

Лекцыі, як вядома, выконваюць не толькі інфармацыйную функцыю, але і дапамагаюць студэнтам арганізоўваць самастойную працу. Сёння ж назіраецца тэндэнцыя да ўсё большага іх скарачэння як на завочнай, так і вочнай формах навучання. Колькасць аўдыторных заняткаў на

завочнай форме навучання фармальна скарачаецца ў працэнтных адносінах ад наяўнасці іх на стацыянары без уліку рэальнага забеспячэння дысцыпліны падручнікамі і вучэбнымі дапаможнікамі.

На наш погляд, дэканату ФЗН трэба даць магчымасць самастойна вырашаць гэтае пытанне. На жаль, падручнікі па гісторыі кнігі практычна адсутнічаюць. Да гэтага часу ў выкладчыкаў Беларускага універсітэта культуры меліся вельмі абмежаваныя магчымасці для таго, каб друкаваць тэксты лекцый. Зараз з умацаваннем выдавецкай базы універсітэта яны значна пашырацца. Ужо ў бягучым годзе павінны выйсці тэксты дзвюх лекцый па гісторыі кнігі. Шкада, што вучэбным планам не прадугледжваюцца аглядныя лекцыі, якія б дапамаглі студэнтам прывесці ў сістэму самастойна здабытыя веды.

Развіццю вучэбнай самастойнасці студэнтаў садзейнічаюць семінарскія заняткі. На курсе гісторыі кнігі на семінары вынесены ключавыя і актуальныя тэмы, якія дазваляюць у поўнай меры рэалізаваць прынцып праблемнасці навучання. Матэрыял гэтых тэм дазваляе вучыць лагічна разважаць, шукаць праўду, рабіць высновы, а галоўнае, абуджае патрэбу ў самастойнай рабоце. Гэта наступныя тэмы: "Гісторыя вынаходніцтва кнігадрукавання", "Сучасны стан кнігавыдання ў свеце", "Адраджэнне выдання беларускамоўных кніг у XIX—пачатку XX ст.", "Тэндэнцыі развіцця кнігадрукавання на Беларусі ў сучасны перыяд".

Лабараторныя работы носяць творчы характар, патрабуюць умення знаходзіць неабходныя звесткі, аналізаваць выдавецкія планы, кніжную прадукцыю па розных прыметах. Усе гэтыя віды заняткаў дапамагаюць выпрацоўваць у студэнтаў патрэбу ў бесперапынным папаўненні ведаў.

Галоўнымі задачамі выкладання на ФЗН з'яўляюцца арганізацыя самастойнай працы студэнтаў у міжсесіённы перыяд, яе індывідуалізацыя. У гэтым сэнсе асабліва вялікае значэнне набываюць кантрольныя работы. Яны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

садзейнічаюць выпрацоўцы навыкаў работы з айчыннай і замежнай літаратурай, дапамагаюць аваляданню методыкай апрацоўкі фактычнага матэрыялу, выклікаюць імкненне да самастойнага аналізу з'яў і фактараў, садзейнічаюць устанаўленню міжпрадметных сувязей пры пошуку літаратуры і раскрыцці вызначанага пытання.

Па гісторыі кнігі студэнтам прапануюцца пазнавальныя і актуальныя тэмы. Колькасць тэм перавышае колькасць студэнтаў на курсе. Такім чынам, кожны студэнт мае сваё асабістае заданне. Дэканат паведамляе студэнтам загадзя аб часе выканання кантрольнай работы. Самастойна выконваючы яе, студэнт-завочнік пазбаўлены непасрэднага кантакту з выкладчыкам. Але індывідуальнасць задання, самастойнасць студэнта ў працэсе выканання работы не азначаюць яго незалежнасці ад выкладчыка.

На жаль, сёння мы пазбаўлены магчымасці даваць групавыя кансультацыі. Яны не плануюцца ў педнагрузцы выкладчыка. Аднак практыка паказвае, што сярод студэнтаў ФЗН ёсць значная колькасць такіх, якія пасля групавой кансультацыі не здольныя выканаць кантрольную работу з першага разу больш-менш якасна. Яны неаднаразова дапрацоўваюць або нават выконваюць яе зноў. Такія студэнты патрабуюць з боку выкладчыка асаблівай увагі, часам неаднаразовых індывідуальных кансультацый. Яны таксама не плануюцца, а значыць, фактычна і не праводзяцца.

Вядома, што выкладчык сёння рэальна пазбаўлены індывідуальных пісьмовых кансультацый, важнейшага спосабу кіраўніцтва самастойнай працай завочніка пры выкананні кантрольных і курсавых работ. Сістэма індывідуальных кансультацый у міжсесіённы перыяд дазволіла б пераадолець існуючыя цяжкасці ў кіраўніцтве самастойнай работай, дапамагла б завочнікам якасна выконваць усе віды работ па гісторыі кнігі, прадугледжаныя вучэбным планам. Сёння толькі за кошт свайго асабістага часу выкладчык можа растлумачыць студэнту-завочніку, як выбраць тэму кантрольнай работы, кіруючыся канкрэтнымі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўмовамі практычнай дзейнасці, асабістай цікавасцю, з улікам гісторыі свайго краю, наяўнасці ў мясцовай бібліятэцы літаратуры пра тое, як пісьменна сістэматызаваць матэрыял, даць спасылкі на выкарыстаныя крыніцы, скласці іх спіс.

Усё гэта не пустыя пытанні, асабліва калі мець на ўвазе, што гісторыя кнігі вывучаецца на першым і другім курсах. Тады студэнты робяць толькі першыя крокі ў асваенні методыкі самастойнай работы і культуры самаадукацыі. На наш погляд, па курсах, якія чытаюцца ў гэты час, трэба планаваць групавыя і індывідуальныя кансультацыі. На жаль, сёння ставіцца пад сумненне і права выкладчыка ўлічваць затрачаны час на паўторнае рэцэнзаванне і абарону кантрольнай работы. Усё гэта не садзейнічае паляпшэнню самастойнай работы студэнтаў-завочнікаў, не стымулюе дзейнасці выкладчыкаў.

Пералічаныя віды заняткаў яшчэ не робяць самастойную работу студэнтаў сістэматычнай, бесперапыннай, рытмічнай, асабліва калі засваенне вучэбнага матэрыялу расцягнута на чатыры семестры. Палепшыць яе можа асноўны вучэбна-метадычны дакумент для завочнікаў у міжсесіённы перыяд – метадычныя ўказанні па дысцыпліне. На аддзяленні бібліятэказнаўства і бібліяграфіі ФЗН Беларускага універсітэта культуры ўжо шмат гадоў запар рэгулярна выдаюцца зборнікі метадычных матэрыялаў для студэнтаў розных курсаў. Іх аб'ём абмежаваны. Туды традыцыйна ўключаюцца тэматычныя планы курсаў, распрацоўкі семінарскіх і лабараторных заняткаў, тэмы кантрольных работ, метадычныя парады, пытанні да залікаў і экзаменаў, пералік асноўнай і дадатковай літаратуры.

Сёлета намі запланавана самастойнае выданне метадычных матэрыялаў па "Гісторыі замежнай і беларускай кнігі", у якім, апрача элементаў, пералічаных у тэматычным плане, будуць давацца не толькі ўсе віды заняткаў, аб'ём гадзін, але і тлумачэнні наконт таго, якія тэмы і віды заняткаў праводзяцца ў перыяд сесіі, а якія выносяцца на самастойнае вывучэнне ў міжсесіённы перыяд. Да апошніх будзе пададзены пералік пытанняў і літаратуры, а таксама

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вызначаны канкрэтны тэрмін засваення матэрыялу. Метадычныя ўказанні будуць прадугледжваць формы справаздачы студэнта-завочніка аб самастойнай працы, вызначаць формы кантролю за ёй выкладчыкам у час сесіі.

Гэта могуць быць экспрэс-апытанні, прагляды канспектаў абавязковай для вывучэння літаратуры, падрыхтоўчых матэрыялаў да семінараў, выпісак з кніг і артыкулаў, нататак планаў, тэзісаў, табліц, схем і г.д. З-за адсутнасці падручнікаў планусцца па ўсіх без выключэння тэмах курса даць пералік асноўных пытанняў і спісы абавязковай і дадатковай літаратуры. Вельмі неабходна зрабіць гэта па гісторыі замежнай кнігі. У такім выглядзе метадычныя матэрыялы, хоць яны і вырастуць па аб'ёме, аднак усё ж пазбавяць студэнтаў цяжкасцей у ходзе пошуку імі вучэбнай і іншай літаратуры.

Усё гэта дазволіць пераўтварыць самастойную працу студэнтаў у кіруемы і рэгулюемы працэс.

***Смагін А.І.***, *дацэнт*

## АСАБЛІВАСЦІ ІНФАРМАЦЫЙНАГА ЗАБЕСПЯЧЭННЯ СТУДЭНТАЎ ФЗН ПА МУЗЫКАТЭРАПІІ

Нягледзячы на тое, што выкарыстанне музыкі ў лячэбных мэтах набывае сёння ўсё большае распаўсюджванне, падрыхтоўка спецыялістаў у галіне музыкатэрапіі ў Беларускім універсітэце культуры яшчэ толькі робіць свае першыя крокі. І гэта нягледзячы на тое, што ў гэтым годзе адбудзецца першы выпуск сацыяльных педагогаў завочнага навучання, якіх спецыяльна набіралі з ліку працуючых у забруджаных радыяцыяй зонах Беларусі з мэтай даць ім спецыялізацыі рэабілітатараў вынікаў Чарнобыльскай катастрофы. Аднак такое становішча мае свае прычыны.

Не выклікае сумнення тое, што сярод лячэбна-выхаваўчых метадаў музыкатэрапія займае асобнае месца сваёй шматбаковай накіраванасцю і вялікім дыяпазонам

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ